**Аляксандр Савіч**
Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт
uleks@tut.by

# Ідэйна-палітычныя погляды М. Арэхвы і А. Бергман як даследчыкаў гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг.

У фарміраванні гістарыяграфічнай традыцыі вялікая роля належыць асобам, якія сваёй арганізацыйнай і навукова-даследчыцкай дзейнасцю садзейнічалі адпаведнаму канцэптуальнаму афармленню пэўных навукова-гістарычных тэм. У дачыненні да вывучэння і асвятлення ў друку пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. сказанае непасрэдна і справядліва тычыцца Мікалая Арэхвы (1902–1992) і Аляксандры Бергман (1906–2005), якіх з поўным правам можна лічыць прызнанымі аўтарытэтамі ў галіне заходнебеларускай гісторыі, адпаведна, у беларускай і польскай гістарычнай навуцы другой паловы XX ст. Іх, сучаснікаў, аб'ядноўвала эпоха і актыўны ўдзел у падпольным камуністычным руху ў Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг., кар'ерныя поспехі, драматычныя і нават трагічныя абставіны рэвалюцыйнай барацьбы, а пазней актыўная навукова-даследчыцкая дзейнасць па вывучэнні гісторыі Заходняй Беларусі, у першую чаргу яе кампартыі (КПЗБ). Пры гэтым, з'яўляючыся неад'емнай часткай навукова-гістарычнай супольнасці БССР і Польшчы другой паловы XX ст., яны дэманстравалі неаднолькавыя падыходы да гісторыі Заходняй Беларусі. Мэтай артыкула з'яўляецца высвятленне праблемна-тэматычнай і ідэйна-палітычнай скіраванасці навуковай дзейнасці М. Арэхвы і А. Бергман. Актуальнасці даследаванню надае адсутнасць у гістарыяграфіі публікацый, накіраваных на асэнсаванне ўказаных аспектаў, сярод нешматлікіх прац пра навукова-гістарычную спадчыну А. Бергман назавём даследаванні Лены Глагоўскай[1] і Вольгі Матусевіч[2], Сяргея Чыгрына[3], а пра

---

[1] Л. Глагоўская, *Даследчыца беларускай гісторыі* [у:] *Евреи Гродно. Очерки истории и культуры*, под ред. М. Кемерова, С. Пивоварчика, Гродно 2000, с. 101–103; яна ж, *Аляксандры Бергман – 95!* [у:] "Ніва" 2001, 13 мая (№ 19); яна ж, *Przedmowa* [у:] Мар'ян Пецюкевіч, *Лісты (1956–1982)*, Беласток 2005, s. 14–17.

[2] О.А. Матусевич, *Национально-освободительное движение в Западной Беларуси в работах Александры Бергман* [у:] "Труды БГТУ. Серия V, Политология, философия, история, филология" 2009, Вып. 17, с. 173–175; яна ж, *Политические партии и общественные организации Западной Беларуси 1920-х–1930-х годов в польской историографии* : дис. … канд. ист. наук : 07.00.09 НАН Беларуси, Ин-т истории, Минск 2009, 167 с.

[3] С. Чыгрын, *Беларускі гісторык з Варшавы Аляксандра Бергман*, "Новы час" [online] http://novychas.info/asoba/bielaruski_historyk_z_varshavy/ [доступ: 28.01.2014].

М. Арэхву – Аляксандра Савіча[1], Людмілы Сяліцкай[2].

Першапачаткова біяграфія М. Арэхвы была характэрнай для пакалення, якое нарадзілася ў пачатку XX ст. Нарадзіўся ён у в. Баруны, што на Ашмяншчыне, у сялянскай сям'і, "выселенай з прыфрантавой паласы ў час першай сусветнай вайны" ў Ноўгарад[3]. Удзельнік грамадзянскай і польска-савецкай войнаў, уступіў у камсамол, у пачатку 1920-х сакратар Наўгародскага павятовага і губернскага камітэтаў Расійскага камуністычнага саюза моладзі (РКСМ). З верасня 1923 г. у апараце ЦК РКСМ, у 1924 г. старшыня Часовага Беларускага Бюро ЦК РКСМ, абраны першым сакратаром ЦК КСМБ, член ЦВК БССР у 1924 г. Са студзеня 1925 г. на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі: сакратар Віленскага акруговага камітэта, член ЦК КПЗБ. У сакавіку 1926 г. арыштаваны, 5 гадоў знаходзіўся ў турмах Польшчы. У 1934–1935 гг. узначальваў Краявы сакратарыят ЦК КПЗБ. З мая 1935 г. член Бюро, з ліпеня 1936 г. прадстаўнік ЦК КПЗБ пры арганізацыйным апараце ЦК Кампартыі Польшчы ў Празе. Са снежня 1939 г. жыў у СССР. У час 2-й сусветнай вайны ў Войску Польскім. З 1945 г. і да сярэдзіны 1950-х гадоў у апараце Міністэрства грамадскай бяспекі Польскай Народнай Рэспублікі[4].

М. Арэхва пазбег рэпрэсій 1930-х гадоў, якія моцна аслабілі заходнебеларускі нацыянальна-вызваленчы рух, у тым ліку яго рэвалюцыйную плынь. Наадварот, яго становішча ў вышэйшым кіраўніцтве КПЗБ яшчэ больш узмацнілася, што, аднак і на жаль, не змагло ўтрымаць ад рэпрэсій яго сям'ю, жонка была арыштаваная і расстраляная, а дачка змешчаная ў дзіцячы дом. Гэтая трагічная старонка асабістай біяграфіі на працягу ўсяго жыцця была для М. Арэхвы незагойнай ранай, аднак не аслабіла яго адданасць ідэалам камунізму, вернасці кампартыі і савецкай уладзе.

Адметнай старонкай біяграфіі М. Арэхвы з'яўляецца навуковая дзейнасць па вывучэнні гісторыі Заходняй Беларусі. Першы вопыт навукова-арганізацыйнай дзейнасці М. Арэхва атрымаў на пачатку 1930-х гадоў, калі пасля вызвалення з польскай турмы быў перапраўлены ў БССР, дзе яму, надзейнаму, праверанаму функцыянеру КПЗБ, была даверана праца ў замежнай рэдакцыі КПЗБ, а ўвосень 1931 г. адказная пасада кіраўніка Камісіі па вывучэнню Заходняй Беларусі (КЗБ) пры Прэзідыуме Беларускай акадэміі навук. Хоць камісія і працавала

---

[1] А.А. С а в і ч, *Эпісталярная спадчына М.С. Арэхвы як крыніца па гістарыяграфіі Заходняй Беларусі*, "Весці НАН Беларусі. Сер. гуманітар. навук" 2014, № 1, с. 65–65; ён жа, *Деятель КПЗБ Н.С. Орехво как представитель научной интеллигенции БССР* [у:] *Интеллигенция современного мира в её многообразии*, Иваново 2013, с. 188–190; ё н ж а, *М.С. Арэхва як арганізатар даследавання Заходняй Беларусі 1921–1939 гг.* [у:] *Личность в истории: героическое и трагическое*, Брест 2012, с. 196–200.

[2] Л. С е л и ц к а я, *Кукла для дочери* [у:] "Беларусь сегодня" [online], https://www.sb.by/articles/kukla-dlya-docheri.html, [доступ: 24.04.2019].

[3] Н.С. О р е х в о, *Дела и люди КПЗБ: воспоминания*, Минск 1983, с. 5.

[4] А.А. С а в і ч, *М.С. Арэхва як арганізатар...*, с. 196.

пад кіраўніцтвам Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б), якое, па звестках А. Бергман, у сваю чаргу знаходзілася пад кантролем ДПУ-НКУС[1], гэта, аднак, не пазбавіла яе супрацоўнікаў шматлікіх чыстак і рэпрэсій. М. Арэхва, уваходзячы адначасова ў склад гісторыка-рэвалюцыйнай камісіі пры Інстытуце гісторыі партыі, працаваў у КЗБ некалькі месяцаў, у студзені 1932 г. у разгар крызісу ў Польшчы і нарастання хвалі рэвалюцыйных падзей у Заходняй Беларусі быў ізноў "камандзіраваны" на партыйную працу[2].

Другі раз лёс непасрэдна звязаў М. Арэхву з заходнебеларускай гістарыяграфіяй у 1956 г., калі пачалося актыўнае вывучэнне гісторыі КПЗБ і Заходняй Беларусі ў цэлым пасля палітычнай рэабілітацыі кампартыі Польшчы і яе складовых частак у час працы ХХ з'езда КПСС. М. Арэхву і іншых ветэранаў рэвалюцыйнага руху, былых членаў КПЗБ, аб'ядноўвала асабістае і карпаратыўнае жаданне грамадска-палітычнай рэабілітацыі, таму яны з энтузіязмам успрынялі магчымасць удзелу ў адпаведных мерапрыемствах. У 1956–1984 гг. М. Арэхва працаваў малодшым, старшым навуковым супрацоўнікам у Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КПБ (ІГП) і, як паказваюць архіўныя дакументы, з'яўляўся адным з асноўных аўтараў і рэцэнзентаў даследаванняў па гісторыі Заходняй Беларусі ў БССР[3]. Пра значнасць асобы М. Арэхвы ў сістэме савецкай заходнебеларускай гістарыяграфіі сведчыць тое, што ён вызначыў кола тых дзеячаў заходнебеларускай гісторыі, каго сам ён "ўпісаў да пераліку прозвішчаў у БелСЭ па раздзеле Зах. Беларусь"[4].

Яго навукова-даследчыцкая праца 1950–1980 гг., паводле створанай ім уласнай бібліяграфіі, склала 80 пазіцый, сярод якіх артыкулы па гісторыі Заходняй Беларусі і КПЗБ у зборніках успамінаў, манаграфіях, рэцэнзіі, кіраўніцтва і непасрэдны ўдзел у складанні зборнікаў дакументаў і матэрыялаў, уступныя словы да разнастайных выданняў[5]. Найбольш значныя яго публікацыі канца 1950-х – пачатку 1960-х гадоў[6] мелі метадалагічнае значэнне і садзейнічалі актывізацыі навуковай працы не толькі па праблемах КПЗБ, але і па іншых пытаннях заходнебеларускай тэматыкі. Ухваленыя ў вышэйшых навуковых і партыйных інстанцыях, яго працы акрэслівалі падыходы да адлюстра-

---

[1] А.А. Савіч, *Арганізацыя даследавання Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гады* [у:] *Гісторыя і традыцыі беларускай навукі (да 90-годдзя Інстытута беларускай культуры)*, Брэст 2012, с. 15.

[2] Н.С. Орехво, *Дела и люди КПЗБ...*, с. 155–157.

[3] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ), ф. 976, воп. 1, спр. 58, ф.1440, воп. 3, спр. 1097, спр. 1100, спр. 1103.

[4] НАРБ, ф.1440, воп. 3, спр. 1097, арк. 69.

[5] НАРБ, ф. 976, воп. 1, спр. 58, арк. 5–18.

[6] М.С. Арэхва, *Рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі ў гады белапольскай акупацыі,* Мінск 1958, 32 с.; ён жа, *К вопросу об истории Коммунистической партии Западной Белоруссии*, "Коммунист Белоруссии" 1957, № 8, с. 25–36; ён жа, *За правильное освещение истории Компартии Западной Белоруссии*, "Коммунист" 1964, № 8, с. 68–79.

вання і ацэнкі падзей гісторыі Заходняй Беларусі, вызначалі станоўчыя моманты і недахопы ў дзейнасці КПЗБ. Маючы перад сабою такую своеасаблівую праграму-схему, гісторыкам заставалася напоўніць яе фактамі і падзеямі, якія павінны былі пацвердзіць загадзя прапанаваныя пазіцыі. Адпаведныя канцэптуальныя падыходы замацаваліся і панавалі ў айчыннай гістарыяграфіі да пачатку 1990-х гадоў, вызначаючы структуру і змест навуковых даследаванняў.

Ужо летам 1956 г. з актыўным удзелам М. Арэхвы былі прынятыя рэкамендацыі па актывізацыі вывучэння гісторыі КПЗБ, сфармуляваныя і зацверджаныя тэзісы па перыядызацыі гісторыі КПЗБ, адпаведны матэрыял стаў канцэптуальнай асновай для будучай абагульняльнай працы па гісторыі КПЗБ, з прапановай аб зацвярджэнні тэматыкі якой М. Арэхва звярнуўся 29 сакавіка 1957 г. да дырэктара ІГП[1]. Гэты праект намаганнямі калектыву аўтараў пад кіраўніцтвам М. Арэхвы быў рэалізаваны ў 1966 г. у выглядзе калектыўнай манаграфіі па гісторыі КПЗБ, аўтарытэтнага выдання, якое не губляе актуальнасці і ў наш час[2]. Сказанае тычыцца і кнігі яго ўспамінаў[3].

Аснову канцэптуальнага бачання М. Арэхвам гісторыі Заходняй Беларусі складае перакананне ў акупацыйнай сутнасці польскага рэжыму, адсталасці і аграрна-сыравінным характары эканомікі, жорсткай эксплуатацыі і нацыянальным прыгнёце, неабходнасці рашучай барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне і ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР, якую праводзіла КПЗБ і падкантрольныя ёй масавыя арганізацыі нацыянальна-вызваленчага руху, у тым ліку Беларуская сялянска-работніцкая грамада (БСРГ). Яскравай рысай навуковага светапогляду М. Арэхвы з'яўляўся тэзіс аб негатыўнай ролі ў грамадска-палітычным жыцці Заходняй Беларусі беларускіх нацыянальна-дэмакратычных дзеячаў і арганізацый, які, аднак, быў значна мадыфікаваны ў бок змякчэння ў кнізе яго ўспамінаў са спасылкай на яго ж перакананні 1930-х гадоў аб неабходнасці пераадолення нацыяналнігілізму ў КПЗБ і супрацоўніцтва "с каждой демократической общественной, культурной и хозяйственной белорусской организацией <…> за белорусский язык, за развитие белорусской культуры"[4]. Нягледзячы на асабістую сямейную драму, у дачыненні да факта рэпрэсавання ўдзельнікаў заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага, у тым ліку і рэвалюцыйнага руху, М. Арэхва ў публікацыях быў стрыманым і лаканічным, дэманструючы сваё адназначнае асуджэнне гэтай з'явы.

У адрозненне ад М. Арэхвы, А. Бергман на сабе і сваёй сям'і цалкам адчула цяжар рэпрэсій. Біяграфія А. Бергман (пры нараджэнні – Эва Кучкоўская) была дастаткова тыповай для ўраджэнкі жыдоўскай сям'і

---

[1] НАРБ, ф.1440, воп. 3, спр. 1116, арк. 41–58, 66.

[2] *Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921–1939 гг.)*, Минск 1966, 403 с.

[3] Н.С. О р е х в о, *Дела и люди КПЗБ ...*

[4] *Ibidem*, с. 228.

заходнебеларускага горада. Нарадзілася яна ў Гродна, у 1923 г. скончыла класічную гімназію Вальдмана, у час навучання ў якой далучылася да камуністычнага руху, уступіла ў камсамол. Працавала ў кравецкай майстэрні, у 1924 г. была абрана ў гарадскі і акруговы камітэты КСМЗБ, у 1925 г. уступіла ў КПЗБ. Па некаторых звестках, у гэты час дзейнічала пад кіраўніцтвам М. Арэхвы, які быў накіраваны ў Заходнюю Беларусь для барацьбы з г. зв. "сэцэсіяй", нацыянальнай беларускай фракцыяй у КПЗБ, прыхільнікаў якой абвінавацілі ў нацыяналізме і ідэямі якой была прасякнута пераважная большасць арганізацый КПЗБ і КСМЗБ. За тое, што не змагла справіцца з уплывам "сэцэсіі" ў падкантрольных ёй арганізацыях, а нават трапіла пад уплыў "сэцэсіі"[1], А. Бергман была знята з пасады сакратара акруговага камітэта камсамола, што, аднак, не прыпыніла яе актыўнай партыйнай дзейнасці. У 1927 г. прайшла навучанне ў партшколе КПЗБ у Мінску, у 1928 г. была ўдзельніцай першага з'езда КПЗБ. У 1929–1931 гг. у Маскве працавала на электразаводзе і вучылася ў Міжнароднай "ленінскай" школе, потым у партшколе КПЗБ у Мінску. У 1931 г. член Краявога Сакратарыята ЦК КПЗБ. У 1934 г. накіраваная ў БССР, у Мінску нарадзілася дачка, пасля некалькіх месяцаў сям'я Бергманаў пераехала ў Гомель, дзе А. Бергман працавала намеснікам сакратара парткама завода "Гомсельмаш". У 1935 г. спачатку яе муж С. Бергман, а потым і яна сама была рэпрэсаваная савецкімі ўладамі, 10 гадоў знаходзілася ў лагерах[2].

Пасля вызвалення з лагера ў 1945 г. А. Бергман выехала ў Польшчу, працавала ў выдавецтве ЦК Польскай рабочай партыі „Książka". У 1948 г. Бергманы пераехалі ў Варшаву, дзе Аляксандра працавала ў Выканаўчым бюро спецыяльнай камісіі па барацьбе з махлярствам. У 1952 г. скончыла завочнае навучанне ў партыйнай школе Цэнтральнага камітэта Польскай аб'яднанай рабочай партыі (ЦК ПАРП), у 1956–1957 гг. уваходзіла ў склад рэдкалегіі часопіса „Życia Partii" і адначасова ў рэдакцыі выдання „Fołksztyme". Пасля выхаду на пенсію ў 1958 г. стала займацца навукова-даследчыцкай дзейнасцю, гэтаму садзейнічала запрашэнне яе ЦК ПАРП як прадстаўніка "старых" камуністычных дзеячаў да напісання ўспамінаў з магчымасцю працы ў партыйных архівах[3].

Вядома, што ў параўнанні з савецкімі, польскія даследчыкі часоў ПНР працавалі ў больш спрыяльных для паўнавартаснай навукой дзейнасці ўмовах з больш ліберальным у параўнанні з БССР архіваводствам, правядзеннем дыскусій і спрэчак, выказваннем альтэрнатыўных меркаванняў у дачыненні розных пытанняў гісторыі Кампартыі Польшчы (КПП), КПЗБ, БСРГ і інш. А. Бергман актыўна і плённа скарыстала такія

---

[1] О.А. Матусевич, *Национально-освободительное движение*..., с. 173; яна ж, *Политические партии и общественные*..., с. 154–175.

[2] Л. Глагоўская, *Даследчыца беларускай гісторыі*..., с. 101–103; яна ж, *Аляксандры Бергман – 95!*...; яна ж, *Przedmowa*...; С. Чыгрын, *Беларускі гісторык з Варшавы*...

[3] H. Głogowska, *Przedmowa*..., s. 16.

магчымасці, дзякуючы чаму ў выніку скрупулёзнай працы ў архівах, перапісцы з зацікаўленымі асобамі, у першую чаргу з ветэранамі-аднапартыйцамі па КПЗБ, змагла стварыць цэлы шэраг змястоўных, з высокай ступенню аб’ектыўнасці навуковых даследаванняў па гісторыі Заходняй Беларусі.

Таксама як і М. Арэхва, А. Бергман эвалюцыянавала ў сваіх падыходах да праблем заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху. У прыватнасці, ад трактоўкі БСРГ як арганізацыі, створанай на аснове партыйнай сеткі КПЗБ і падпарадкаванай ёй, ад асуджэння нацыяналістычнай сутнасці Беларускай сацыялістычнай грамады і Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі (БРА), а таксама палітыкаў, якія стаялі на нацыянальных некамуністычных пазіцыях, яна перайшла да гістарычнай рэабілітацыі гэтых жа палітыкаў і беларускай нацыянальнай ідэі, асуджэння нацыянал-нігілізма ў шэрагах КПЗБ[1].

Свой багаты ўнёсак у гістарыяграфію гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. А. Бергман, былы вязень сталінскіх лагероў, выявіла напісаннем нарысаў пра жыццядзейнасць рэпрэсаваных слынных дзеячаў беларускага руху, у першую чаргу А. Луцкевіча, які як “галоўны наццэм” Заходняй Беларусі не мог атрымаць аб’ектыўных ацэнак савецкай гістарычнай навукі, а таксама Л. Родзевіча, І. Дварчаніна, С. Рак-Міхайлоўскага, М. Бурсевіча, П. Валошына, У. Самойла-Сулімы і іншых, важнейшыя этапы асабістага жыцця і палітычнай кар’еры якіх з цяжкасцю ўпісваліся ў афіцыйны гістарыяграфічны дыскурс БССР. Найбольшую ж вядомасць А. Бергман атрымала, дзякуючы напісанню біяграфіі Браніслава Тарашкевіча, якую з-за цэнзурных цяжкасцяў апублікавала толькі праз восем гадоў спачатку ў Польшчы, а пазней Рэспубліцы Беларусь[2]. Да нашага часу не губляюць актуальнасці яе даследаванні, у першую чаргу кніга *Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej*[3], а таксама шматлікія іншыя публікацыі[4]. Значнасць даследаванняў узмацняюцца ўласным досведам А. Бергман, яе знаёмствам з кіраўнікамі КПЗБ і фактам яе актыўнага ўдзелу ў грамадоўскім руху: “я же знала все округа [КПЗБ. – *А. С.*], кроме Пинска, а в 1926 г. на протяжении 9 мес. собственными ручками и собственными ножками (гл. образом) топала по Баранавичскому округу и вплоть до февраля 1927 г. – э. зн. весь период Грамады – што понятно не пропало”. Пра гэта яна з задавальненнем пісала М. Арэхву, дадаючы: “Да, в этом отношении мне повезло больше, чем тебе”[5], пэўным чынам непрыемна кранаючы адрасата, які, будучы адным з удзельнікам вядомай нарады ў Сопаце, спрычыніўся да арганізацыі БСРГ, аднак пік грамадоўскага руху прасядзеў у турме.

---

[1] О.А. Матусевич, *Политические партии и общественные…*, с. 67–68.

[2] A. Bergman, *Rzecz o Bronisławie Taraszkiewiczu*, Warszawa 1977, 243 s.; яна ж, *Слова пра Браніслава Тарашкевіча: Гістарычны жыццяпіс*, Мінск 1996, 192 с.

[3] A. Bergman, *Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej*, Warszawa 1984, 287 s.

[4] О.А. Матусевич, *Политические партии и общественные…*, с. 116–117, 124–126.

[5] НАРБ, ф. 976, воп. 1, спр. 47, арк. 10.

Адзначым імкненне А. Бергман рэабілітаваць асобу А. Луцкевіча ў артыкуле пра яго ў *Polskim Słowniku Biograficznym*[1]. Пісаць аб ім было цяжка з-за цэнзуры і таго, што яе "намеру супраціўляліся даўнейшыя дзеячы з кіраўніцтва КПЗБ", для якіх А. Луцкевіч быў палітычным апанентам, і якія культывавалі яго адмоўны вобраз у друку[2]. Магчыма, у дадзеным выпадку яна мела на ўвазе М. Арэхву, у публікацыях якога А. Луцкевіч, адзін з галоўных "беларускіх буржуазных нацыяналістаў" і ідэйных апанентаў М. Арэхвы, пададзены выключна негатыўна. Аднак першым словам публічнай абароны А. Луцкевіча яшчэ ў 1960-я гады стала выказванне вядомага актыўнага ўдзельніка беларускага руху ў міжваеннай Польшчы М. Пецюкевіча, якое зрабіла вырашальны ўплыў на саму А. Бергман, што яна прызнавала[3]. Яна выявіла кірунак, які ў БССР не мог быць актуальным з-за відавочна тэндэнцыйнай і аднабаковай схемы гісторыі Заходняй Беларусі, у якой для беларускіх нацыянальных дзеячаў, у тым ліку і А. Луцкевіча, не знаходзілася месца, акрамя як згадак пра іх варожасць і згодніцтва, і якія падаваліся польскай даследчыцай як частка больш прыязнай для іх польскай грамадска-палітычнай сістэмы.

У 1960–1970 гг. паміж М. Арэхвам і А. Бергман існавалі добразычлівыя адносіны, якія ўзмацняліся іх рэвалюцыйным мінулым. Яны абодва сутыкаліся з сітуацыяй стрымлівання іх навукова-даследчыцкіх памкненняў, бачылі, што гістарычная рэабілітацыя КПЗБ і ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху мела цяжкасці. У прыватнасці, як сама гаварыла А. Бергман, у канцы 1950-х гадоў ёй "пришлось в основном самой разгрызать и помучаться над пониманием многих вопросов, связанных с Громадой. <…> Ого! Не мало было помех (понятно со стороны своих, и угроз и чего только хочешь). Но мне помогло разобраться в самых сложных вопросах то, что я знала хорошо механизм действия нашего [відавочна маецца на ўвазе КПЗБ. – *А. С.*] аппарата (во всех его звеньях)"[4]. З аналагічнага кшталту непаразуменнем у партыйна-дзяржаўных інстанцыях сутыкаўся і М. Арэхва, які ў 1965 г. у скарзе ў ЦК КПБ не хаваў свайго абурэння дзеяннямі супрацоўніка, які "вместо солидного разговора по существу дела <…> старался дискриминировать меня, отрицая мое право суждения". Са слоў М. Арэхвы, адказны партфункцыянер выказаўся да яго зусім нелагодна: "То, что вы в прошлом были секретарем ЦК КПЗБ… не дает вам права навязывать свою точку зрения"[5].

Калі ў сярэдзіне 1960-х гадоў М. Арэхва ўцягнуўся ў спрэчку з беларускай даследчыцай Тамарай Глінскай адносна, па меркаванні М. Арэх-

---

[1] A. Bergman, *Antoni Łuckiewicz* [у:] *Polski Słownik Biograficzny*, Kraków 1973, t. 18/4, s. 514–515.

[2] А. Бергман, *Яшчэ раз пра Антона Луцкевіча*, "Arche" 2009, № 8, с. 70; О.А. Матусевич, *Политические партии и общественные…*, с. 136.

[3] H. Głogowska, *Przedmowa…*, s. 14.

[4] НАРБ, ф. 976, воп. 1, спр. 55, арк. 10.

[5] НАРБ, ф.1440, воп. 3, спр. 1100, арк. 166.

вы, неналежнага навуковага ўзроўню яе манаграфіі, то звярнуўся да А. Бергман з просьбай прарэцэнзаваць манаграфію Т. Глінскай. А. Бергман прыслухалася да звароту і ў 1966 г. выдала ў польскім часопісе "Z pola walki: Zeszyty wydziału Historii partii KC PZPR" крытычную рэцэнзію на кнігу Т. Глінскай[1].

М. Арэхва і А. Бергман актыўна абмяркоўвалі поспехі ў справе вывучэння і папулярызацыі гісторыі КПЗБ, па-сяброўску дзяліліся навуковай інфармацыяй і асабістымі ўражаннямі. У прыватнасці, А. Бергман у 1974 г. папракала М. Арэхву за неналежны падбор аўтараў зборніка матэрыялаў канферэнцыі да юбілею КПЗБ, у 1977 г. яна ўзняла пытанне пра Ігната Дварчаніна, заклікаючы "штосьці зрабіць, каб другім не павадна было" для абароны яго памяці[2]. М. Арэхва высока ацаніў даследаванне А. Бергман пра Б. Тарашкевіча, адзначыўшы ў сваіх заўвагах да артыкула пра кіраўніка Грамады ў БелСЭ, што ў спасылках на крыніцы трэба на першае месца ставіць працу А. Бергман, "а потым – усе астатнія. Яна галоўны даследчык біяграфіі Б. Тарашкевіча", у прыватным лісце да А. Бергман М. Арэхва віншаваў аўтарку "з вялікім навуковым поспехам"[3].

Аднак паступова іх добразычлівыя адносіны перайшлі да непрыязні; заўважаецца суперніцтва і зайздрасць, падаграваная іх былымі аднапартыйцамі. Каталізатарам пагаршэння ўзаемаадносін сталі мемуары "найгалоўнейшага гісторыка КПЗБ" М. Арэхвы *Дела и люди КПЗБ*, неадназначна ўспрынятыя былымі аднапартыйцамі[4]. А. Бергман, пра якую мемуарыст згадаў толькі аднойчы як паспяховага камсамольскага кіраўніка ў Гродна і Вільні, мемуары падштурхнулі да выступлення ў друку з адмоўнай рэцэнзіяй[5]. Негатыўнае стаўленне да мемуарыста выяўляе першы абзац, які ўтрымлівае спрэчную думку аб адсутнасці сур'ёзнага манаграфічнага даследавання гісторыі КПЗБ, ігнаруючы згаданую вышэй калектыўную манаграфію па гісторыі КПЗБ і М. Арэхву як суаўтара і кіраўніка аўтарскага калектыву выдання. А. Бергман рашуча крытыкуе меркаванне М. Арэхвы аб вырашальнай ролі КПЗБ у стварэнні БСРГ, замоўчванне ім БРА і яе рэпрэсаваных правадыроў, фактычна абвінавачваючы яго, як аднаго з кіраўнікоў партыі і суаўтара знакамітага артыкула першай паловы 1930-х гадоў аб "нацыянал-апартунізме" ў КПЗБ, у дачыненні да разгортвання рэпрэсій супраць сябраў БРА, Грамады і КПЗБ. Пры гэтым А. Бергман адводзіць аналагічныя абвінавачванні ад кіраўнікоў КПП, якія актыўна садзейнічалі пастаноўцы пытання аб нацыянал-апартунізме ў КПЗБ. На яе

---

[1] A. B e r g m a n, *Глинская Т.Ю. КПЗБ – руководитель освободительной борьбы трудящихся Западной Белоруссии. 1924–1928 гг. Минск : Беларусь, 1965. 200 с.*, "Z pola walki" 1966, № 4, s. 174–177.

[2] НАРБ, ф. 976, воп. 1, спр. 47, арк. 9адв., 19.

[3] НАРБ, ф.1440, воп. 3, спр. 1097, арк. 99, 139.

[4] НАРБ, ф. 976, воп. 1, спр. 55, арк. 17–18, 22–23адв.

[5] A. B e r g m a n, *Na marginesie wspomnień Mikołaja Orechwy*, "Przegląd Historyczny" 1985, № 4, s. 855–859.

думку, успаміны М. Арэхвы не садзейнічаюць аб'ектыўнаму пазнанню гісторыі КПЗБ.

Закранаючы гісторыка-антрапалагічныя аспекты навуковай дзейнасці А. Бергман, яе псіхаэмацыйныя пачуцці, можна гаварыць пра асабістую крыўду яе на М. Арэхву. Гэта праглядваецца як у дачыненні да яго паспяховай палітычнай кар'еры ў КПЗБ, так і высокага грамадска-навуковага аўтарытэту М. Арэхвы ў БССР як прызнанага "галоўнага спецыяліста па гісторыі КПЗБ". Асабістая крыўда А. Бергман магла ўзнікнуць з-за магчымых несправядлівых дзеянняў да яе з боку М. Арэхвы ў 1926 г., а таксама ў пэўным дачыненні яго да рэпрэсій у адносінах членаў КПЗБ, у першую чаргу яе і яе сям'і, якое выявілася тым, што М. Арэхва, як кіраўнік КПЗБ у 1930-я гады, што падкрэслена ў першым жа абзацы згаданай рэцэнзіі, не абараніў сваіх аднапартыйцаў ад несправядлівага пакарання.

Разважаючы пра навукова-даследчыцкія прыярытэты М. Арэхвы і А. Бергман, неабходна мець на ўвазе іх прыхільнасць да розных дзяржаўна-палітычных прыярытэтаў. Адпаведныя падыходы ўзніклі яшчэ ў пачатку 1920-х гадоў і тычыліся статусу Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы, характару і сутнасці рэвалюцыйнага руху і КПЗБ, месца і ролі беларускіх палітычных і нацыянальна-культурных арганізацый і дзеячаў. У сярэдзіне 1920-х гадоў, на падставе рознага бачання названых пытанняў, у камуністычным руху Заходняй Беларусі разгарэліся гарачыя спрэчкі, што прывялі да вострай фракцыйнай барацьбы ў КПЗБ. Прыхільнікі першай пазіцыі, "большасці" ў КПЗБ, лічылі Рыжскі мір несправядлівым, польскую ўладу – акупацыйнай, Заходнюю Беларусь неад'емнай часткай беларускай этнічнай тэрыторыі, прыкладвалі ўсе намаганні, ажно да ўзброенага паўстання, дзеля "сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення і ўз'яднання з БССР". У супрацьвагу гэтаму, другая пазіцыя – прапольскі настроенай "меншасці" КПЗБ – знаходзілася пад уплывам кіраўніцтва КПП і ў сваіх адносінах да Заходняй Беларусі лічыла, што "акупацыі ніякай няма", што беларускія землі да Польшчы адышлі паводле міждзяржаўнага пагаднення – Рыжскай мірнай дамовы, Заходняя Беларусь – ёсць "крэсы ўсходнія" Польшчы, арганічная яе частка, КПЗБ – складовая частка польскай кампартыі і польскага камуністычнага руху. У гэтым плане паказальным з'яўляецца тлумачэнне пазіцыі польскіх камуністычных правадыроў беларускімі дзеячамі КПЗБ: "<u>Оккупации никакой нет, а трактат есть трактат</u> [тут і далей падкрэслена ў тэксце крыніцы. – *А. С.*]. По мнению тогдашнего ЦК значило, что <u>законная</u> Польша вполне <u>законным</u> образом (по Рижскому Трактату) владела <u>законными</u> крессами – и коммунисты этих самых «кресов» должны были выбросить из своей головы всякую мысль об оккупации и стать чуть ли не лояльными гражданами и подданными Польши, радуясь величию и могуществу своего новообретенного отечества"[1].

---

[1] Российский государственный архив социально-политической истории, ф. 495, оп. 129, д. 71, арк. 3.

Аналіз публікацый М. Арэхвы і А. Бергман па прынцыпова важных паказчыках адносіць іх, адпаведна, да першай і другой канцэпцый. Аддаючы А. Бергман даніну шчырай павагі і вялікай удзячнасці за вывучэнне гісторыі Заходняй Беларусі, адзначым, што ў яе творчасці выразна выяўляецца актуалізацыя польскіх прыярытэтаў, паводле якіх заходнебеларуская гісторыя – частка польскай гісторыі. А. Бергман узмацняе перакананне ў яе прапольскай ідэйна-палітычнай пазіцыі ў дачыненні да Заходняй Беларусі і яе гісторыі, разважаючы пра выключную ролю “крэсаў” у нацыянальна-дзяржаўнай справе Польшчы[1]. Паводле А. Бергман, мэтай дзейнасці КПЗБ было аб’яднанне ўсіх нелегальных рэвалюцыйных арганізацый “на паўночна-ўсходніх тэрыторыях Польшчы” з агульнапольскім рэвалюцыйным рухам, упарадкаваць арганізацыйныя справы, зыходзячы са спецыфікі тэрыторыі, і такім чынам памножыць сілы і ўплыў (чытаем – польскія) у “найшырэйшых народных масах тых абшараў”[2]. Гаворачы пра “беларускую праблему” ў КПЗБ, яна відавочна лічыць гэтую партыю часткай польскай кампартыі[3], адмаўляючы ў яе дзейнасці самастойныя беларускія мэты і задачы. Нават згадваючы “сэцэсію”, аўтарка не называе прычын, па якіх беларускія камуністы наважыліся разарваць адносіны з КПП[4]. Паглыбляючыся ў праблему генезісу і сутнасці камуністычнага руху і КПЗБ, А. Бергман паўтарае шырока распаўсюджаныя той час у КПП папрокі да КПЗБ з-за вялікага адсотку ў ёй сялян, з-за чаго партыя губляе “пралетарскую” сутнасць[5]. Яна канцэнтруе ўвагу на разважаннях польскіх камуністаў 1920-х гадоў, для якіх нечаканасцю стала “беларускасць” КПЗБ па назве і па справах, значная падкантрольнасць яе Мінску, а тэрыторыі Заходняй Беларусі ўладам БССР. Пры гэтым А. Бергман абапіраецца на спрэчнае меркаванне літоўскіх камуністаў В. Міцкявічуса-Капсукаса і А. Ангарэціса, якія выступілі з думкай аб несправядлівасці пашырэння на Віленшчыну лозунга самавызначэння Заходняй Беларусі і ўз’яднання з БССР[6]. Не прамінула польская даследчыца прывесці і частыя згадкі 1920-х гадоў “на старонках санацыйных газет”, прызначаных для беларускіх абшараў, пра “незалежную Беларусь”, якая можа ўзнікнуць пасля далучэння Савецкай Беларусі да Заходняй, відавочна дзякуючы польскай вызваленчай акцыі[7].

У публікацыях А. Бергман можна заўважыць і іншыя прыклады “паланізацыі” заходнебеларускай гісторыі міжваеннга часу. Можна сказаць, што польскія нацыянальна-дзяржаўныя прыярытэты ў яе навуко-

---

[1] A. B e r g m a n, *Sprawy białoruskie...,* s. 73.

[2] A. B e r g m a n, *Kwestia białoruska w Komunistycznej Partii Zachodniej Białorusi,* "Przegląd Historyczny" 1971, № 62/2, s. 226.

[3] A. B e r g m a n, *Sprawy białoruskie...,* s. 12.

[4] *Ibidem*, s. 79.

[5] *Ibidem*, s. 98–99.

[6] *Ibidem*, s. 78, 80–81.

[7] A. B e r g m a n, *Kwestia białoruska...,* s. 235.

вых поглядах выразна дамінавалі, вызначаючы сутнасць навуковай канцэпцыі гісторыі Заходняй Беларусі. А. Бергман можна лічыць не толькі гісторыкам-папулярызатарам заходнебеларускай гісторыі, але спраўным выканаўцам польскага дзяржаўна-палітычнага прапагандысцкага заказу ва ўмовах камуністычнай Польшчы. Такі падыход, народжаны і яскрава праяўлены ў польскай гістарыяграфічнай традыцыі міжваеннага часу, і ў наш час мае месца. Так, па словах Любові Козік, польскія гісторыкі вельмі актыўна ў апошнія дзесяцігоддзі даследуюць гісторыю ўсходніх ваяводстваў міжваеннай Польскай Рэспублікі і адлюстроўваюць падзеі пераважна праз прызму польскай дзяржавы і яе інтарэсаў[1].

Відавочна, што лібералізацыя грамадска-палітычнага жыцця ў Польшчы ў 1980-я гады давала дадатковыя магчымасці А. Бергман у аповедах пра падзеі 1920–1930-х гадоў быць больш фактаграфічна абгрунтаванай, выказваць і, дзякуючы свайму аўтарытэту, усталяванаму ў час камуністычнай Польшчы, укараняць свой погляд на складаныя і неадназначныя падзеі гісторыі Заходняй Беларусі. М. Арэхва, на жаль, не меў такое магчымасці, перабудова ў СССР толькі-толькі пачыналася, пра галоснасць толькі пачыналі гаварыць, у той час як у партыйна-наменклатурных колах БССР узмацняўся кансерватыўны кірунак. У пачатку 1980-х гадоў М. Арэхва, крытык і цэнзар партыйна-дзяржаўнай ідэалагічнай сістэмы, вымушаны быў змірыцца з тым, што яго мемуары, своеасаблівую споведзь аўтара, падверглі крытычнаму рэдагаванню і "чыстцы", пасля якіх несумненна змястоўныя і цікавыя ўспаміны страцілі вельмі шмат каштоўнай інфармацыі, а самога аўтара на зыходзе гадоў пакрыўдзілі, гэткім чынам "аддзячыўшы" за старанную і адданую працу на карысць партыі і дзяржавы[2]. М. Арэхву было крыўдна і за стаўленне да яго мемуараў і асабіста да яго А. Бергман, якая павінна была зразумець, і напэўна разумела сістэму партыйнай навукі і цэнзуры, якая і прывяла да многіх недахопаў, у тым ліку адзначаных А. Бергман у сваёй рэзкай рэцэнзіі. У адным з лістоў ад 1 верасня 1986 г. М. Арэхва ў роспачы скардзіцца на "дыскусійны артыкул А. Бергман" аб кнізе яго ўспамінаў: "Чаму ў названым артыкуле так шмат жоўці і азлобленасці супраць мяне"[3]. Але адказваць публічна на прэтэнзіі былой паплечніцы М. Арэхва, знясілены фізічна і эмацыйна, не стаў.

Такім чынам, М. Арэхва і А. Бергман, нягледзячы на падабенства асабістых біяграфій і ідэйна-палітычных поглядаў часоў падпольнай камсамольска-камуністычнай маладосці, у сваіх навуковых канцэпцыях прынцыпова адрозніваліся сваім стаўленнем да Заходняй Беларусі. М. Арэхва адстойваў беларускія савецкія нацыянальна-дзяржаўныя погляды, аснову якіх складалі тэзы аб польскай акупацыі Заходняй

[1] Л. К о з і к, *Wojciech Śleszyński, Województwo poleskie, Kraków 2014, ss. 336,* "Białoruskie Zeszyty Historyczne" 2016, № 45, s. 254.

[2] Л. С е л и ц к а я, *Кукла для дочери...*

[3] НАРБ, ф. 976, воп. 1. спр. 41, арк. 14–14 адв.

Беларусі, нацыянальным і сацыяльным уціску, барацьбе за вызваленне ад яго пад кіраўніцтвам партыі заходнебеларускага пралетарыяту горада і вёскі – КПЗБ. А. Бергман сваю навуковую кар'еру пачынала ў партыйна-ідэалагічных структурах ПАРП, якія пераняслі ад міжваеннай КПП усе асноўныя погляды на пазначаныя пытанні. Яе працы ў дачыненні да Заходняй Беларусі выяўляюць польскія нацыянальна-дзяржаўнай прыярытэты, якія зыходзяць з тэзісаў аб законнасці ўваходжання "крэсаў" у склад Польшчы паводле Рыжскага міру як яе арганічнай часткі, аб'ектыўным характары складанасцяў гаспадарча-эканамічнага жыцця Заходняй Беларусі, мінімалізацыі акупацыйнай сутнасці і жорсткасці рэжыму польскай улады, пазіцыянаванне беларускага руху як часткі агульнапольскага грамадска-палітычнага жыцця.

*Aliaksandr Savich*

**Ideological and political views of N. Orekhvo and A. Bergman as researchers of the history of Western Belarus 1921–1939**

Abstract

The article examines the main stages of the biography, political and scientific career of the leaders of the revolutionary movement in Western Belarus in the 20–30s of the 20th century, the Belarusian Soviet historian Nikolai Orekhvo and the polish historian Alexandra Bergman who, in the second half of the 20th century, were the most authoritative specialists in the scientific and historical-science community of Western Belarus. A comparative analysis of their biographies and basic scientific works made it possible to reveal the essential differences in the fundamental aspects of the history of Western Belarus, in the consideration of which N. Orekhvo hailed from a Belarusian Soviet background and A. Bergman shared Polish national-state priorities.